Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ), эксклюзіўны партнёр міжнароднай асацыяцыі BirdLife International пры падтрымцы: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, РУП «Белпошта», РЭЦДЮ



# Нацыянальная кампанія «КНІГАЎКА – птушка 2006 года»



## Акцыя «Самы вялікі гарадок кнігаўкі»

Калі ў вашай мясцовасці з аднаго месца можна ўбачыць больш 10 кнігавак, неабходна запісаць месца знаходжання калоніі, прыкладную колькасць пар кнігаўкі, дату назірання, прозвішча, імя, адрас, тэлефон і праслаць гэтыя звесткі ў АПБ да 31 мая 2006 года.



## Конкурс выяўленчага мастацтва

Прымаюцца малюнкі, аплікацыі, вышыўкі, скульптуры. Работа павінна мець аўтарскую назву. Не прымаюцца малюнкі зробленыя простым алоўкам, а таксама працы з пластыліну. Усе работы павінны суправаджацца інфармацыяй аб аўтарах адпаведна агульным патрабаванням да конкурсных работ (глядзі на адвароце).

Конкурсныя малюнкі дасылайце ў рэгіянальныя аддзяленні АПБ (адрасы на адвароце).

Работы прымаюцца: да 31 мая 2006 года.

Узрост удзельнікаў: да 17 год.

## Конкурс казкі пра кнігаўку

Казка можа даваць адказ на адзін з наступных пытанняў:

– Чаму кнігаўка, убачыўшы чалавека, пытаецца: «Чые Вы?»
– Чаму кнігаўка будуе гнёзды на зямлі?
– Чаму кнігаўка прылятае з першымі праталінамі?

Можна пісаць казкі і на іншыя тэмы, выкарыстоўваючы асаблівасці птушкі.
Дасылаць працы лепш у надрукаваным ці электронным выглядзе.
Казкі трэба дасылаць на адрас АПБ: г. Мінск, а/с 081, 220023
Работы прымаюцца: да 15 кастрычніка 2006 года.
Для афармлення работы глядзіце агульныя патрабаванні да конкурсных работ.





## Конкурс на лепшы фотаздымак кнігаўкі

Прымаюцца фотавыявы кнігавак у прыродным асяроддзі. Не прымаюцца фотаздымкі гнёзд з яйкамі і птушанятамі. Фотаздымкі павінны быць фарматам не менш 10 x 15 см.

Работы прымаюцца: да 15 кастрычніка 2006 года.

Адрас АПБ: а/с 081, г. Мінск, 220023
Тэл.: +375 17 263 01 30; факс: +375 17 263 06 13; e-mail: apb_pr@tut.by

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ), эксклюзіўны партнёр міжнароднай асацыяцыі BirdLife International пры падтрымцы: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, РУП «Белпошта», РЭЦДЮ

# 10 фактаў пра кнігаўку:

1. Зімуе ў Францыі.
2. Прылятае ў Беларусь звычайна ў канцы лютага.
3. Самка па афарбоўцы падобна да самца, абодва аднолькава клапоцяцца аб патомстве.
4. На гнездавым участку крычыць: «Чые вы?»
5. Гняздо на зямлі, на лузе ці на полі.
6. У поўнай кладцы заўсёды 4 яйкі.
7. У канцы мая пачынаецца міграцыя да месц зімоўкі.
8. Каля 100 000 пар ў Беларусі: 1 пара на 100 беларусаў.
9. Колькасць амаль ва ўсіх краінах Еўропы скарачаецца.
10. «Чайка» – на польскай і ўкраінскай мовах;
    «Кібіц» – на нямецкай; «Ківіт» – на галандскай;
    «Чыбіс» – па-цюркскі і на рускай мове.





**Мастацкія работы трэба дасылаць у рэгіянальныя аддзяленні АПБ:**

Брэсцкая вобласць: Лапай Н.А., вул. Камарова, д. 7, в. Гаравата, п/а Ляхавічы, Іванаўскі р-н., Брэсцкая вобл., 225807

Магілёўская вобласць: Сідарэнка А.У., г. Магілёў, а/с 1, 212017
Гродзенская вобласць: Гуменны В.С., пр-т Я.Купалы, д. 82, гімназія №1, г. Гродна, 230010

Гомельская вобласць: Зеніна І.М., вул. Лясная, д. 7, кв.1, г. Тураў, Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл., 247980

Віцебская вобласць: Бараноўскі А.Л., Аляксінечская СШ, в. Аляксінічы, Сенненскі р-н, Віцебская вобл., 211131

Мінская вобласць: АПБ, г.Мінск, а/с 081, 220023

**Агульныя патрабаванні да конкурсных работ.**

Без выканання гэтых патрабаванняў работы прымацца не будуць!
На кожнай рабоце павінны быць: пазначаны імя, імя па бацьку, прозвішча, узрост, дакладны адрас і тэлефон аўтара, калі аўтар з'яўляецца сябрам якога-небудзь гуртка, неабходна напісаць назву гуртка, адрас, а таксама імя, прозвішча кіраўніка гуртка і яго тэлефон. Конкурсныя работы не вяртаюцца. Яны могуць быць выкарыстаны для выставаў і публікацый у выданнях АПБ, а таксама ў газетах і часопісах з захаваннем аўтарства. Па выніках правядзення кампаніі «Птушка года» плануецца выпуск зборнікаў дзіцячых казак, малюнкаў і плакатаў.

**Узнагароджанне пераможцаў.**

Лаўрэатам усіх конкурсаў будуць уручаны дыпломы, прызы і сувеніры. Усе ўдзельнікі атрымаюць лісты з падзякай і налепку з кнігаўкай.

Отпечатано в типографии ЗАО «Юнипак», лицензия ЛП № 02330/0148762 от 30.04.2004. Заказ №260, тираж 3000 экз.